**І. М. Тананка**

# МІФАЛАГІЧНЫЯ ВОБРАЗЫ Ў КАЗКАХ Я. БАРШЧЭЎСКАГА І В. ГАЎФА

Міфалогія – сістэма сакральных ведаў народа, значная частка яго нацыянальнай культуры. Невыпадкова міфалагічныя матывы і вобразы разнастайна ўвасабляюцца ў творах мастацкай літаратуры, асабліва ў казках. Даследчык міфалогіі Дж. Кэмпбэл у прадмове да манаграфіі «Герой з тысячай твараў» заявіў, што міфы розных народаў свету, хоць і валодаюць пэўнымі культурнымі асаблівасцямі, маюць значна больш падабенстваў, чым адрозненняў. З гэтага сцвярджэння вынікае, што і творы літаратуры, заснаваныя на міфах, нават на міфах розных краін, з высокай верагоднасцю будуць мець падобныя рысы. Аналіз казак беларускага пісьменніка-рамантыка Я. Баршчэўскага і нямецкага навеліста В. Гаўфа паказаў слушнасць гэтай думкі.

Так, Я. Баршчэўскі ў «Ваўкалаку» і В. Гаўф у казцы «Каліф-бусел», каб паказаць складаную ўнутраную барацьбу галоўных герояў, робяць іх «пярэваратнямі» – міфалагічнымі істотамі – людзьмі, здольнымі ператварацца ў адушаўлёныя і неадушаўлёныя прадметы. Пярэварацень-ваўкалак – вобраз з беларускай міфалогіі. У германскай традыцыі падобныя істоты завуцца «аўфхокерамі». Толькі праз перамогу над негатыўнымі праявамі ўласнай душы героі вятаюць сваё чалавечае аблічча.

У казках «Вогненныя духі» і «Халоднае сэрца» галоўныя героі звяртаюцца да магічных істот, каб тыя дапамаглі ім атрымаць багацце. У творы Баршчэўскага ролю дэманічнага персанажа адыгрывае чарнакніжнік або чорт – дух, які паводле беларускай міфалогіі ўводзіў чалавека ў грэх. Аналагам чорта ў германскай традыцыі з'яўляецца Мефістофель, вядомы дзякуючы легендзе пра доктара Фаўста. У «Халодным сэрцы» Гаўфа адпаведным вобразам з'яўляецца так званы «шкляны чалавечак». Гэта аўтарскі вобраз, але ж яго сатанінская сутнасць відавочна праз чырвонае з чорным адзенне, выгляд карузліка, у якім часта паўстае д'ябал у германскай

традыцыі. Пацвярджаецца гэта і тым, што пры напісанні казкі пісьменнік натхняўся навелай В. Ірвінга «Том Уолкер і д’ябал», дзе дэманічнае паходжанне падобнай істоты нават не хавалася.

У «Вогненных духах» Баршчэўскага і «Караблі-прывідзе» Гаўфа, каб папярэдзіць чытачоў і галоўных герояў не дапускаць маральнага падзення, выкарыстоўваецца міфалагічны вобраз «непрытомнікаў» – нячыстых нябожчыкаў, якія не растрацілі жыццёвую энергію, па начах выходзяць з магіл і не даюць людзям спакою. У германскім фальклоры падобныя з’явы звязаны з такой міфалагічнай істотай як «гонгер». Гонгеры – непрытомнікі, якія не маюць магчымасці самастойна пакінуць свет жывых, таму што пакінулі тут нешта важнае або не загладзілі свае грахі.

Такім чынам, у аўтарскіх казках Я. Баршчэўскага і В. Гаўфа прысутнічаюць характэрныя для беларускай і нямецкай міфалогіі вобразы, пры гэтым назіраецца іх падабенства і блізкая мастацкая інтэрпрэтацыя ў творах.